Минска www.minsk-old-new.com. Кроме того, существуют, но на данный момент не обновляются познавательные сайты узкого профиля, как то: виртуальная генеалогическая энциклопедия «Родовые фамилии Шамбер, Глот, Гузень, Корда, Семашко» (www.shamber.info), электронная база данных первоисточников по истории Беларуси IX–XVIII веков (www.starbel.narod.ru/5rir.htm), электронный сборник лекций по истории и культуре Беларуси (www.belarusianhistory.narod.ru).

Белорусский сегмент Интернета наполняется мультимедийными проектами и все чаще используется как площадка для распространения произведений искусства, трансляции аудиовизуальных работ, общественных и культурных инициатив, основанных на взаимодействии пользователей. Популярный интерактивный медиапроект «Глобус Беларуси» (www.globus.tut.by) имеет целью составление карты архитектурных и культурных ценностей страны совместными усилиями всех посетителей сайта. На популярном молодежном ресурсе www.34mag.net, активно публикующем мультимедийные проекты, так же активно работает лейбл «Пяршак», издающий в электронном и физическом виде дебютные произведения молодых белорусских писателей, музыкантов, художников.

Другие примеры мультимедийных проектов – историко-культурный проект «90s", посвященный 1990-м гг. в Беларуси (www.90s.by); мультимедийный проект по переводу иностранных фильмов на белорусский язык «Кіно па-беларуску"(www.futubela.tv); свежий виртуальный проект 3Д-восстановления архитектурных памятников Беларуси www.vkl3d.com. Появление этого проекта, а также других сложных в визуализации виртуальных туров и экскурсий (по Несвижскому замку, дому-музею Адама Мицкевича в Новогрудке) свидетельствует о том, что в байнете расширяется сфера 3Д-моделирования и интерактивного взаимодействия с пользователем.

Это лишь малая часть интернет-ресурсов о культуре и искусстве Беларуси, которая дает вполне ясное представление обо всем объеме и характере этой сферы.

***Крывашэй Д. А.***
*(Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*

## ДЗЯРЖАЎНАЯ КУЛЬТУРНАЯ ПАЛІТЫКА Ў БЕЛАРУСІ Ў ГАЛІНЕ КІНАБСЛУГОЎВАННЯ НАСЕЛЬНІЦТВА (1991–2010)

У пачатку 1990-х сістэма кінаабслугоўвання насельніцтва апынулася ў крызісе. Гэта было звязана са скарачэннем аб'ёмаў дзяржаказу, адсутнасцю прафесіянальнай маркетынгавай службы, ліквідацыяй цэнтралізаванай сістэмы кінапракату і стварэннем самастойных кінавідэааб'яднанняў (шасці абласных і мінскага гарадскога). Дзейнасць апошніх не падлягала адзінай пракатнай палітыцы. Імкненне да прыбытку прывяло да рэпертуарнага дысбалансу на карысць амерыканскай забаўляльнай кінапрадукцыі і знікненню з экранаў фільмаў беларускай вытворчасці [1, спр. 3, арк. 2, 8].

Відавочным стаў працэс змены профілю кінатэатраў, адток з кінасеткі кваліфікаваных спецыялістаў у камерцыйныя структуры. Назіралася зніжэнне эканамічнай эфектыўнасці дзейнасці дзяржаўнага сектара, адбывалася інтэнсіўнае скарачэнне ахопу насельніцтва гэтымі паслугамі. Калі ў 1990 г. кінаўстановак налічвалася 6916, то ў 1993 г. – 4168 ці на 40 % меней. Адбыўся значны спад колькасці наведванняў гледачамі кінавідэазалаў (глядзі Табліцу 1). Сярэдняя запаўняльнасць глядзельнай залы ў першай палове 1993 г. складала: у г. Мінску – 22 %, у абласных цэнтрах – 17 % [1, спр. 10, арк. 145–146].

Табліца 1 Колькасці кінаўстановак і відэаустановак, наведанне

| | 1990 | 1991 | 1993 | 1995 | 2000 | 2001 | 2002 | 2003 | 2005 | 2007 | 2009 | 2010 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **кінаўстановак** | 6916 | 5976 | 4168 | 3780 | 3063 | 2951 | 2642 | 2329 | 1997 | 1715 | 1212 | 992 |
| наведвальнікаў (млн.) | 117 | 94 | 30 | 12,4 | 11,8 | 11 | 8,3 | 8,4 | 8,7 | 8,7 | 9,0 | 9,4 |
| **відэаўстановак** | 483 | - | 319 | 266 | 331 | 346 | 367 | - | 459 | 583 | 683 | 748 |
| наведвальнікаў (млн) | 4,8 | - | 2,3 | 1,3 | 2,2 | 2,3 | 2,2 | - | 4,4 | 5,4 | 5,8 | 5,97 |

У лютым 1993 г. калегія Міністэрства культуры вырашыла распрацаваць праект стварэння Дзяржаўнай рэспубліканскай кінавідэапракатнай кампаніі. Планавалася цэнтралізаваць закупку кінавідэафільмаў у маштабах рэспублікі, наладзіць рэгулярны дубляж лепшых узораў замежнага кінамастацтва на беларускую мову, упарадкаваць узаемаадносіны паміж дзяржаўным кінавідэапракатам і альтэрнатыўным пракатам, абмежаваць аплату паслуг пасрэднікаў у пракаце фільмаў, правесці перарэгістрацыю кінатэатраў, кінаўстановак і відэазалаў з мэтай аптымізацыі структуры кінавідэасеткі. Калегія лічыла неабходным увайсці ва Ўрад з просьбай прыраўняць падаткаабкладанне камунальных паслуг для кінавідэасеткі, паменшыць падаткі і мытныя пошліны для прадпрыемстваў, якія выраблялі кінатэхналагічнае абсталяванне і запасныя часткі для яго, да нормаў, якія на той час былі ўстаноўлены для культасветустаноў, а таксама аб пераводзе вясковай і часткова гарадской кінавідэасеткі на бюджэтнае фінансаванне. Было вырашана стварыць у цэнтральным апараце міністэрства аддзел па кінематаграфіі і кінафікацыі з функцыямі каардынацыі і кантролю за развіццём кінапрацэсу і ўсебаковага забеспячэння яго эфектыўнасці [1, спр. 3, арк. 2–4].

На забеспячэнне адзінага парадку дэманстрацыі кінавідэапрадукцыі на тэрыторыі краіны была накіравана распрацаваная ў 1993 г. Міністэрствам культуры комплексная праграма. Яна ўключала цэнтралізаванае фарміраванне кінавідэарэпертуару, узмацненне базавых пазіцый нацыянальнага кінематографа ў візуальных камунікацыях, абмежаванне самастойнасці гаспадарчай дзейнасці кінавідэасеткі, выдзяленне ўзорна-паказальных, апорных кінавідэаўстановак і кінатэатраў, якія на практыцы ажыццяўлялі культурную палітыку дзяржавы [1, спр. 10, арк. 148–149].

Створаны ў сакавіку 1993 г. Дзяржаўны рэгістр кінавідэафільмаў і кінавідэапраграм узяў пад кантроль суб'екты кінавідэабізнесу і стаў ажыццяўляць адзіны парадак дэманстрацыі кінавідэатвораў на тэрыторыі краіны. Адным з напрамкаў дзейнасці Дзяржрэгістра было забеспячэнне падрыхтоўкі дакументаў на выдачу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Міністэрствам культуры юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам спецыяльных дазволаў (ліцэнзій) на здымкі, тыражаванне, дэманстрацыю і пракат кінавідэапрадукцыі, а таксама абарот эратычнай прадукцыі. У 2003 г. супрацоўнікамі Дзяржрэгістра было падрыхтавана 123 ліцэнзіі на кінавідэадзейнасць. З 1 лістапада 2003 г. у адпаведнасці з Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 ліпеня 2003 г. № 17 ліцэнзаванне Міністэрствам культуры згаданых відаў дзейнасці было спынена. Замест іх сталі выдавацца пракатныя пасведчанні [1, спр. 887, арк. 137].

Крокам у вырашэнні праблем кінаабслугоўвання стала прынецце 29 верасня 1993 г. пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 647 «Аб дзяржаўнай падтрымцы нацыянальнай кінематаграфіі». Аблвыканкамам і Мінгарвыканкаму сумесна з Міністэрствам культуры даручалася прыняць неадкладныя меры для захавання ў гарадскіх і сельскіх населеных пунктах аптымальна неабходнай колькасці кінатэатраў і кінавідэаўстановак і павысіць эфектыўнасць іх выкарыстання для паляпшэння культурнага абслугоўвання насельніцтва. На жаль, палажэнні дакумента ў сувязі з эканамічным крызісам так і засталіся не выкананымі [2, спр. 10, арк. 11].

Немалыя дзяржаўныя сродкі, якія накіроўваліся непасрэдна ў аблвыканкамы, распыляліся пры набыцці кінапрадукцыі. У выніку гэтага рэпертуар бяднеў у жанравым і ў якасным сэнсе. Міністэрства не мела рычагоў для выпраўлення сітуацыі. У сярэдзіне 1990-х гг. асноўны аб'ём экраннага часу (да 80 %) складалі амерыканскія фільмы катэгорыі «Б» – так званай другараднай прадукцыі, прызначанай для маларазвітых краін. Нізкія ідэйна-мастацкія якасці рэпертуару былі асноўнай прычынай скарачэння колькасці наведвальнікаў кінатэатраў [2, спр. 57, арк. 130–131].

У красавіку 1996 г. Міністэрства культуры накіравала ва Ўрад краіны прапановы па паляпшэнню кінавідэаабслугоўвання насельніцтва. У выпадку прыраўнання дзяржаўных гасразліковых пракатных арганізацый па падатках да дзяржбюджэтнай сферы адпаведныя адлічэнні павінны былі скласці 1,7 % замест 20,7 %. Гэта дазволіла б выкарыстоўваць грошы, якія б заставаліся на рахунку гэтых арганізацый, на набыццё кінавідэафільмаў і рэканструкцыю матэрыяльна-тэхнічнай базы [1, спр. 92, арк. 47].

У 1996 г. бачылася найбольш перспектыўным напрамкам захавання кінасеткі і паляпшэння абслугоўвання насельніцтва арэнда працоўнымі калектывамі і акцыяніраванне кінатэатраў. Прадстаўлялася мэтазгодным дазволіць гэтым кінатэатрам большую гаспадарчую самастойнасць, у прыватнасці, здаваць у субарэнду памяшканні без шкоды для кінапаказу пры ўмове накіравання ўсёй атрыманай сумы на паляпшэнне абслугоўвання гледачоў [1, спр. 92, арк. 48].

Урад краіны пастановай № 838 ад 27 снежня 1996 г. прадугледзеў захаванне ў гарадах абласнога падпарадкавання не менш за адзін кінатэатр на 150 тыс. жыхароў і не менш аднаго кінатэатра ў раённых цэнтрах. Дакумент рэкамендаваў мясцовым Саветам дэпутатаў прадставіць дзяржаўным кінатэатрам ільготы па падатках і іншых плацяжах, якія паступаюць у мясцовыя бюджэты.

5 снежня 2002 г. калегія Міністэрства культуры абмяркоўвала вынікі кінавідэаабслугоўвання насельніцтва. Звярталася ўвага на працяг працэсу скарачэння стацыянарных кінаўстановак, што прыводзіла да скарачэння колькасці гледачоў. За перыяд з 1990 па 2001 год агульная колькасць кінаўстановак скарацілася ў 2,3 разу (у сельскай мясцовасці – у 2 разы), колькасць месцаў для гледачоў – у 1,8 разу. Агульная лічба наведванняў скарацілася ў 10,5 разоў (гл. Табліцу 1). Сярод праблем, якія стрымлівалі паляпшэнне кінавідэаблугоўвання насельніцтва, была састарэласць кінапраекцыйнага абсталявання, значная амартызацыя будынкаў (80 % з іх патрабавалі рамонту і мадэрнізацыі). Пэўныя праблемы стварала адсутнасць цэласнасці кінавідэасеткі і органаў кіравання кінафікацыяй у некаторых абласцях [1, спр. 587, арк. 40].

У Табліцы 5.5.2 прыведзены паказчыкі наведвання ў разліку на 1 жыхара. Як можна заўважыць, адзіным месцам, дзе назіралася павелічэнне колькасці гледачоў, быў г. Мінск. У перыяд з 1997 па 2001 г. у сталіцы назіралася павялічэнне ў 3 разы. Гэтаму спрыялі змены ў рэпертуарнай палітыцы. На экранах з'явіліся фільмы класа «А», прэм'ерныя, фестывальныя і г. д. Па новаму стала будавацца праца з гледачом. У кінатэатрах з'явіліся ільготныя кінасеансы.

Найбольшы эфект з пункту гледжання пашырэння рэпертуару і паляпшэння якасці паказу мела выкарыстанне відэапраектных установак. У адпаведнасці з пратаколам даручэнняў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 12 чэрвеня 2001 г. № 23 за кошт мясцовых бюджэтаў толькі ў 2002 г. было набыта 26 відэапраектных комплексаў [3, с. 50–51]. На канец 2006 г. у краіне дзейнічала каля 400 такіх відэасістэм. У наступныя гады іх колькасць працягвала расці і ў 2010 г. іх налічвалася 748 адзінкі. З мэтай прыцягнення гледачоў праводзілася аснашчэнне кінатэатраў гукавымі сістэмамі Dolby, праводзіўся капітальны рамонт і рэканструкцыя кіназалаў. На 1 студзеня 2007 г. у рэспубліцы былі абсталяваны гэтымі сістэмамі 25 кіназалаў [4, с. 126]. У верасні 2008 г. у Мінску адкрыўся першы ў краіне мультыплекс «Беларусь», які налічваў пяць кіназалаў. У 2010 г. у кінатэатрах гарадоў Барысаў, Брэст, Гомель, Гродна, Ліда і Мінск былі ўсталяваны сістэмы лічбавага 3D-кінапаказу [5, с. 81].

Аднак і гэтыя меры не дазволілі ўтрымаць гледача. У далейшым лічба наведання зменшылася на чвэрць у 2007 г. у параўнанні з 2001 г. Толькі ў 2010 г. назіраўся некаторы рост гэтага паказчыка. У той жа час наведанне кінасеансаў у Мінскай вобласці няўхільна падала на фоне неістотнага паляпшэння становішча ў іншых абласцях у 2010 г. (гл. Табліцу 2).

**Табліца 2 Колькасць наведванняў кінасеансаў у сярэднім на 1 жыхара (уласныя падлікі па [3, с. 55; 5, с. 30; 6, с. 26])**

| Вобласць | **1990 г.** | **1995 г.** | **2001 г.** | **2007 г.** | **2010 г.** |
|---|---|---|---|---|---|
| Брэсцкая | 11,7 | 1,2 | 0,9 | 0,4 | 0,5 |
| Віцебская | 11,4 | 0,7 | 0,6 | 0,3 | 0,3 |
| Гомельская | 12,4 | 1,3 | 0,7 | 0,7 | 0,8 |
| Гродзенская | 10,8 | 1,4 | 0,6 | 0,4 | 0,5 |
| Мінская | 12,1 | 1,6 | 1,5 | 1,2 | 1,0 |
| Магілёўская | 10,1 | 1,4 | 0,5 | 0,7 | 0,7 |
| г. Мінск | 11,0 | 0,9 | 2,7 | 2,0 | 2,4 |
| **Па краіне** | 11,5 | 1,2 | 1,1 | 0,9 | 1,0 |

З мэтай павелічэння долі фільмакопій беларускай і расійскай вытворчасці і рэгулявання колькасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фільмапрадукцыі замежных краін 24 сакавіка 2005 г. была створана Каардынацыйная рада па закупцы кінавідэапрадукцыі. У выніку зменаў у рэпертуарнай палітыцы кінавідэапракатных арганізацый у кінатэатрах краіны ў 2005 г. назіраўся рост колькасці паказаў прадукцыі расійскай і беларускай вытворчасці (больш 40 % ад агульнай колькасці фільмаў для дарослай аўдыторыі і больш за 60 % – для дзіцячай) [7, арк. 134].

У адпаведнасці з даручэннем Прэзідэнта Рэспублік Беларусь ад 20 чэрвеня 2005 г. на ўпраўленні ідэалагічнай работы аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама быў ускладзены кантроль за рэпертуарнай палітыкай і набыццём новай фільмапрадукцыі [8, т. 4, арк. 7]. У краіне праводзілася стварэнне адзінай структуры кінавідэасеткі і сістэмы кіравання кінавідэапракатнымі прадпрыемствамі. У Брэсцкай вобласці асобным рашэннем аблвыканкама ў ліпені 2005 г. было створана КУП «Кінавідэапракат» з філіяламі ў гарадах Баранавічы і Пінск з захаваннем за ўпраўленнем культуры аблвыканкама кіравання дадзеным органам галіновага кіравання. У Віцебскай вобласці ў 2005 г. было адменена рашэнне аблвыканкама аб перадачы шэрагу кінатэатраў у раённую ўласнасць. Кінатэатры засталіся на балансе УП «Кінавідэапракат» Віцебскага аблвыканкама. У Магілёўскай вобласці ў тым жа годзе кінавідэапрадпрыемствы былі перададзены як маёмасныя комплексы ў абласную ўласнасць. З раённай у абласную камунальную ўласнасць бязвыплатна была перададзена маёмасць аддзелаў культуры, якая прызначалася для кінавідэаблугоўвання насельніцтва. У г. Мінску ў той час 17 кінатэатраў былі аб’яднаны ў адзіную сетку, пераўтвораны ў філіялы структуры УП «Кінавідэапракат» Мінскага гарвыканкама [7, арк. 142].

Праз два гады адбылася новая рэарганізацыя. Гарвыканкамам і райвыканкамам былі перададзены будынкі, пабудовы і іншая маёмасць кінапракатных арганізацый акрамя той, што знаходзілася ў абласных цэнтрах. У Брэсцкай вобласці былі створаны кінавідэацэнтры аддзелаў культуры райвыканкамаў без стварэння юрыдычнай асобы. Баранавіцкі кінатэатр «Кастрычнік» і Пінская гарадская кінавідэасетка сталі асобнымі ўстановамі культуры. У Віцебскай вобласці былі створаны кінавідэацэнтры раённых і гарадскіх аддзелаў культуры без стварэння юрыдычных асобаў. У Гомельскай вобласці – раённыя камунальныя кінавідовішчныя унітарныя прадпрыемствы. У Гродзенскай – камунальныя унітарныя кінавідовішчныя прадпрыемствы «Райкінавідэасетка». У Магілёўскай – структурныя падраздзяленні аддзелаў культуры гаррайвыканкамаў а таксама камунальнае ўнітарнае прадпрыемства (КУП) «Бабруйсккіно». У Мінскай вобласці былі створаны КУП раёнаў і г. Жодзіна [9, т. 9, арк. 88–89].

Шэраг мерапрыемстваў у напрамку развіцця кінавідэапракату і кінавідэапаказу ўтрымлівала Канцэпцыя развіцця кінематаграфіі Рэспублікі Беларусь на 2009–2014 гг. Пачынаючы з 2010 г. у бюджэтах абласцей і г. Мінска было запланавана выдзяленне субсідый на пакрыццё стратаў дзяржаўных кінавідапракатных арганізацый пры паказе фільмаў беларускай вытворчасці, прызнаных у вызначаным парадку нацыянальнымі і створаных па дзяржаўнаму заказу. Датацыі атрымалі дзяржаўныя арганізацыі, якія займаліся пракатам і паказам фільмаў у сельскай мясцовасці, малых і сярэдніх гарадах, а таксама гарадах абласнога падпарадкавання. Субсідаваўся кінавідэапаказ і кінавідэапракат некамерцыйных і дзіцячых фільмаў, арганізацыя спецыяльных сеансаў для сацыяльна неабароненых катэгорый насельніцтва па ільготных коштах. Для кінавідэабслугоўвання сельскага насельніцтва праводзілася работа па набыццю стацыянарных і перасоўных відэапракатных комплексаў. Толькі за першае паўгоддзе 2010 г. было набыта 12 відэапраекцыйных сістэм і 1 аўтамабіль. Побач з гэтым Канцэпцыя прадугледжвала паступовы пераход арганізацый кінавідэапракату і кінапаказу ў г. Мінску і абласных цэнтрах на самаакупнасць. Складана было рэалізаваць палажэнні аб прыцягненню на беларускі рынак і інвеставанню сродкаў замежных фірм у рэканструкцыю кінатэатраў [9, т. 7, арк. 26, 27, 33].

Такім чынам, дзяржаўная палітыка ў галіне кінаабслугоўвання ў даследуемы перыяд была накіравана на захаванне гледача пры адначасовым змяншэнні бюджэтных выдаткаў на сферу кінапракату. Структура апошняга перажыла некалькі рэарганізацый, што было абумоўлена пошукамі аптымальных суадносін паміж павелічэннем прыбытковасці і паляпшэннем рэпертуару кінавідэапракатных устаноў.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 974. – Воп. 4.

2. НАРБ. Ф. 974. – Воп. 1.

3. Беларуская культура сёння. Гадавы агляд (2002) / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Белар. дзярж. ін-т праблем культуры; навук. рэд. У. П. Скараходаў. – Мінск : БелДІПК, 2003. – 208 с.

4. Беларуская культура сёння: гадавы агляд, 2006 / Абламскі В. Я. [і інш.]; навук. рэд. І. Б. Багачова. – Мінск : Беларус. дзярж. ін-т праблем культуры, 2007. – 188 с.

5. Беларуская культура сёння : гадавы агляд, 2010 / І. В. Анціпенка [і інш.]; пад агул. рэд. Т. І. Стружэцкага. – Мінск : БДУ культуры і мастацтваў, 2011. – 144 с.

5. Организации культуры в Республике Беларусь в 2007 году. Статистический сборник / Мин. стат. и анализа Респ. Беларусь. – Минск : Минстат, 2008. – 50 с.

6. Учреждения культуры и искусства Республики Беларусь в 2003 году. Статистический сборник / Мин. стат. и анализа Респ. Беларусь. – Минск, 2004. – 43 с.

7. Архіў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь за 2001 г. Пратаколы № 6–7 пасяджэнняў калегіі Міністэрства і дакументы да іх.

8. Архіў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь за 2008 г. Справа 01–03. Пратаколы пасяджэнняў калегіі Міністэрства і матэрыялы да іх. Т. 4.

9. Архіў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь за 2010 г. Справа 01–09. Даручэнні Прэзідэнта, Нацыянальнага сходу, Адміністрацыі Прэзідэнта, Савета міністраў Рэспублікі Беларусь, рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання і дакументы па іх выкананню. Т. 7, 9.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Куринная А. В.*
*(Республика Украина, г. Харьков)*

# ТЕОРИЯ «КОНФЛИКТА» В СОВРЕМЕННОМ СЦЕНАРНОМ МАСТЕРСТВЕ ЭКРАННОГО ПРОИЗВЕДЕНИЯ

Современное сценарное мастерство экранного искусства, на сегодняшний день, находится в поле интенсивного развития. На постсоветском пространстве в разное время было создано немало работ посвященных теории сценарного мастерства, в частности, теории кинодраматургии: В. Волькенштейна «Драматургия кино», В. Туркина «Драматургия кино. Очерки по теории и практике киносценария», В. «Юнаковского «Построение киносценария» и многих других. Однако теория изучения сегодняшних сценарных форм, новые учебные пособия с учетом новшеств и открытий в данной области – все это остается проблемным полем «сценарного мастерства». Особенный интерес, на наш взгляд, является изучение «частностей» – элементов драматургии, которые зачастую в практических трудах для студенчества, рассматриваются авторами достаточно сжато и бегло. Речь идет, например, о таких наиболее важных для создания экранной драматургии составляющих как – «композиция», «художественный образ» и особенно – «конфликт». А между тем, именно эти «частности» являются основой будущего экранного произведения; и именно эти «частности» полны противоречий и вопросов.

В данном докладе мы остановимся на наиболее противоречивом, на наш взгляд, термине – «конфликт».

А. Эйнштейн утверждал, что «все идеи в науке родились в драматическом конфликте между реальностью и нашими попытками ее понять». В контексте данного высказывания «конфликт» как теоретический аспект составляющий ткань искусства, а именно – драматургическую конструкцию экранного произведения, представляется достаточно интересным и заслуживающим научного исследования аспектом. Особенно данный вопрос актуален в последнее время, когда роль «конфликта» в драматургии в представлении некоторых современных драматургов постепенно теряется. Более того, снова и снова возникают идеи творческих экспериментов, в процессе которых предлагается избавление от «конфликта» как драматургической составляющий и, как следствие, тяготение к «бесконфликтной драматургии». А между тем, в результате таких экспериментов нарушается ткань драматургической структуры, впрочем, к чему и стремятся подобные модные «новоискания».

Обращаясь к степени изученности данной проблематики, следует отметить, что наибольшее исследование данного аспекта в экранном искусстве, очевидно именно в кинодраматургии. Среди современных исследователей теорией «конфликта», в частности, широко занимались: Л. Л. Геращенко (в диссертационном исследовании «Конфликт в отечественном документальном кино 90-х гг.»), Р. С. Ибрахим (в исследовании «Философия конфликта в экранном искусстве А. Тарковского»), некоторые аспекты конфликта рассматривает в своем труде «Поэтика кино» Р. Руис (в частности, глава «Теория центрального конфликта»). В виду же отсутствия широкого изучения теледраматургии, серьезных исследований в области конфликта практически нет.

Что есть такое «конфликт» в современной теледраматургии? Насколько принципы классического понимания этого термина являются применимыми для нее? И может ли вообще в современном телепространстве существовать «бесконфликтная» драматургия?

Итак, что есть такое «конфликт»? Согласно «Словарю русского языка» С. И. Ожегова «Конфликт – это столкновение, серьезное разногласие, спор» [5, с. 237].

Находим так же следующее определение: «Конфликт – (от лат. *conflictus*) – обязательный элемент структуры драматургического произведения – столкновение противоположных идей и взглядов, обострение споров, которое имеет форму драматической борьбы» [2, с. 112].

Вышеперечисленные трактовки, конечно же, достаточно общие, однако в них очевидна действенная сущность конфликта, что, в свою очередь, наиболее точно выражают специальные терминологические источники. Среди них и словарь П. Пави, согласно которому конфликт (франц.: *conflit*; англ.: *conflict*; нем.: нем.: *konflikt*; исп.: *conflicto*) в драматургии означает столкновение противоположных сил и мнений. П. Пави, в частности, акцентирует внимание на том, что «драматический конфликт проистекает из столкновения антагонистических сил драмы. В конфликте противостоят друг другу персонажи, взгляды на мир или различные позиции в определенной ситуации… Конфликт находится лишь в драматургии действия (подчеркнуто мною. – А. К.). Однако, в театре, например, существуют и такие театральные формы, в которых конфликт может отсутствовать вовсе (например, в эпическом или азиатском театре)» [6, с. 161–163]. Итак, конфликт является, двигателем действия, своего рода, его «сердцем».

Интересно, что в психологическом аспекте мы находим многочисленные *классификации конфликтов.* «Основаниями для них могут быть источник конфликта, содержание, значимость, тип разрешения, форма выражения, тип структуры взаимоотношений, социальная формализация, социально-психологический эффект, социальный результат. Конфликты могут быть скрытые и явные, интенсивные и стертые, кратковременные и затяжные, вертикальные и горизонтальные и т. д. Так, согласно У. Линкольну, положительное воздействие конфликта проявляется в следующем: конфликт ускоряет процесс самосознания; под его влиянием утверждается и подтверждается определенный набор ценностей; способствует осознанию общности, так как может оказаться, что у других сходные интересы, и они стремятся к тем же целям и результатам и поддерживают применение тех же средств – до такой степени, что возникают официальные и неофициальные союзы; приводит к объединению единомышленников; способствует разрядке и отодвигает на второй план другие, несущественные конфликты; способствует расстановке приоритетов; играет роль предохранительного клапана для безопасного и даже конструктивного выхода эмоций; благодаря ему обращается внимание на недовольство или предложения, нуждающиеся в обсуждении, понимании, признании, поддержке, юридическом оформлении и разрешении; приводит к возникновению рабочих контактов с

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ